View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**«КРЫТЫКУ»** («Дарэмна ловіце вы ў сетку матылька…»), верш Б. Датуецца 1910, напісаны ў Яраслаўлі. Верш шматзначны па сваім вобразным напаўненні. З аднаго боку, яго літаральны ўзровень звязаны з гісторыяй напісання і публікацыі твора, з другога — набывае філас.-эстэт. сэнс: звяртаючыся да вобраза матылька, якога схапіў чалавек, «каб лепей скрыдлы разглядзець», Б. мае на ўвазе паэт. творчасць (як і любую творчасць наогул, у т.л. навук.). Магчыма, пад вобразам крытыка ён падразумявае *Ядвігіна Ш.*, але назва мае абагульняльнае значэнне: крытык — той, хто ацэньвае любую творчасць, любое стварэнне чалавека, які нясе адзнаку таленту, геніяльнасці, адыгрывае вял. ролю ў творчым развіцці нацыі і ўвогуле чалавецтва.

Маст. твор прыпадабняецца да матылька, які адначасова прыгожы і мае пэўную форму, акрэсленыя ўзоры. Такія ўзоры можна разгледзець і ў творы. Але маст. твор, як і матылёк, – гэта жывое, трапяткое і, на жаль, крохкае стварэнне. Ён мае пэўныя абрысы, але і ўтрымлівае ў сабе жывую душу, жыццё, г.зн. тое, што рухае матыльком, дазваляе яму лётаць і весці сваё адасобленае ад іншых існаванне. Спроба гвалтоўным чынам разгледзець, з чаго складаецца жывое, якія рысы мае адухоўленае нечым вышэйшым існаванне, мае непазбежнае наступства: матылёк (як і любы іншы твор) проста гіне. Жаданне зблізку разгледзець прыгажосць, памацаўшы яе для вернасці і чысціні эксперымента ўласнымі рукамі, вядзе да знікнення таго, што прываблівала вочы, радавала гледача.

Верш мае і значнае ўскоснае значэнне ў кірунку метадалогіі навук. і маст. творчасці. Пра гэта таксама клапаціўся Б. і як творца (вершы «Ліст да п. В.Ластоўскага», «Апавяданне пра іконніка і залатара» і інш.) і як навуковец («Санет»). З аднаго боку, перавага фармальных параметраў перад змястоўным напаўненнем рэчы вядзе да знішчэння пэўных яе якасцей, магчыма, да знішчэння яе самой. З другога, у паэт. форме Б. выказана вельмі цікавая думка пра частку і цэлае: агульнае большае за свае часткі, паколькі змяшчае ў сабе і т.зв. эмерджэнтныя якасці, або тое, што надае жыццё, адухаўляе і прыроду, і створанае творчай фантазіяй чалавека. І жаданне разабраць твор «па палічках» вядзе да страты цэласнага ўяўлення.

Упершыню — «Голас беларуса», № 57, 10.6.1927 пад рэд. загалоўкам «Невядомыя творы М.Багдановіча (з архіва Зямкевіча)».

*Г.Я.Адамовіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ